Тэма. **Зямля Беларусі—краіна герояў**

Мэта: стварыць умовы для фарміравання ў вучняў паняццяў “герой”, “подзвіг”, ведаў аб Дзяржаўны сімвалах Рэспублікі Беларусь, развіцця пазнавальных інтарэсаў, цікавасці да гісторыі Рэспублікі Белару садзейнічаць выхаванню ў вучняў патрыятычных пачуццяў; актыўнай жыццёвай пазіцыі.

Афармленне. Карта Беларусі, Дзяржаўныя герб і сцяг, фотаздымкі Марата Казея, У.М.Карвата, П.І.Клімука, У.В.Кавалёнка, партрэт Ф.Скарыны.

Ход урока.

I. Вітаю Вас на першым у новым навучальным годзе ўроку. Давайце прачытаем тэму нашага ўрока. Як вы думаеце, аб чым пойдзе гаворка?

Ёсць словы вельмі значныя: мір, зямля, праца, свабода, хлеб. Ёсць родныя, дарагія словы: маці, бацька, сябар, бабуля, дзядуля., Радзіма.Што ж абазначае слова “Радзіма”?

**Метад незакончаных сказаў: “Радзіма—гэта...”**

Гэта і лес, і поле, і вузкая сцяжынка, і спевы птушак, і гарады, і вёскі. Гэта месца, дзе чалавек нарадзіўся, жыве. Як называецца краіна, у якой мы жывём? А наша вёска як называецца? У якім раёне яна знаходзіцца?

Беларусь, як і кожная краіна, мае свае Дзяржаўныя сімвалы. Назавіце іх. Дзе вы маглі бачыць герб і сцяг Рэспублікі Беларусь?

- На будынках органаў дзяржаўнай улады,
- на дзяржаўных дакументах,
- на грашовых знаках і дзяржаўных пячатках,
- на формах ваеннаслужачых і адзенні касманаўтаў,
- на касцюмах спартсменаў,
- на ардэнах і медалях,
- на парадах, у час правядзення мітынгаў і дэманстрацый,
- на алімпійскіх гульнях, у гонар чэмпіёнаў,
- на будынках у святочныя дні,
- у дні жалобы.

А як патрэбна адносіцца да Дзяржаўных сімвалаў нашай краіны?

II. Сваю Радзіму любіць кожны чалавек. Аб любві да роднай зямлі людзі складалі песні, прыказкі, прымаўкі. Якія з іх вы ведаеце?

**Гульня “Раскіданыя прыказкі”**

Радзіма-маці—умей за яе пастаяці.

Чалавек без Радзімы, што салавей без песні.

Жыць—Радзіме служыць.

Лепшая вадзіца з роднай крыніцы.

Родная зямля мякчэйшая за чужую пярыну.
Якая прыказка вам найбольш спадабалася і чаму?

III. Мы не першыя жывём на сваёй зямлі і не апошнія. Са старажытных часоў жылі на гэтай зямлі нашы продкі, дзяды і прадзеды, нашы бацькі. Ім прыходзілася бараніць сваю Радзіму ад ворагаў, будаваць і ўмацоўваць яе. Таму і гавораць:" Зямля беларусаў—краіна герояў". А хто такія героі? **Гульня "Кругавая гутарка"**

Зварот да тлумачальнага слоўніка.

Герой—храбры, самаадданы чалавек, які робіць подзвігі. Подзвігі могуць быць як ваенныя, так і працоўныя, і сёння вы аб гэтым даведаецеся.

1 верасня пачынае тыдзень пісьменства і друку. А хто з вас памятае, хто пачаў першы друкаваць кнігі на нашых землях? Што вам вядома аб гэтым славутым чалавеку?

Як называлася першая беларуская кніга? Як вы думаеце, ці лёгка Ф.Скарыне было пачынаць такую справу, быць першым? Ці можам мы назваць Ф.Скарыну героем? А зараз мы апынёмся ў мінулым стагоддзі. Незаўсёды наша Беларусь была свабоднай і незалежнай. Чатыры гады Вялікай Айчыннай вайны былі самыя суровыя і гераічныя. На абарону Радзімы ад нямецка-фашыстскіх захопнікаў падняліся і дарослыя і дзеці.

Хлопчык Марат Казей нарадзіўся ў в.Станькава ў Дзяржынскім раёне. Ужо ў першыя дні вайны ён пайшоў змагацца ў партызанскі атрад. Разам з дарослымі Марат жыў у лесе, быў разведчыкам, знішчаў фашыстаў, пускаў пад адкос цягнікі.

11 мая 1944 года піянер прыняў свой апошні бой. Ён з таварышам прыйшлі ў вёску з чарговым заданнем. Раніцай награнулі фашысты. Разведчыкам удалося вырвацца за аколіцу, але таварыш Марата быў забіты. Хлопчык метка страляў з аўтамата. Калі закончыліся патроны, Марат спыніўся з апошняй гранатай у руцэ. Ён пачакаў, пакуль фашысты падыдуць бліжэй, і ўзарваў гранату. Хлопчык загінуў, і разам з ім загінулі нямецкія салдаты.

За мужнасць і бясстрашнасць Марату Іванавічу Казею было пасмяротна прысвоена ганаровае званне Героя Савецкага Саюза. У адным з Мінскіх паркаў устаноўлены подзвіг піянеру-герою. Сюды прыходзяць хлопчыкі і дзяўчынкі і клянуцца любіць сваю зямлю так, як любіў яе Марат Казей. Яму было толькі 15 гадоў, але ён не пашкадаваў жыцця за сваю Радзіму.

Фізхвіліна.

Героем можна стаць не толькі ў ваенныя гады, але і ў мірны час. Званне "Герой Беларусі"—найвышэйшая адзнака нашай дзяржавы. А ці ведаеце вы, хто стаў першым Героем Беларусі? Ім стаў ваенны лётчык падпалкоўнік У.М.Карват. (дэманстрацыя партрэта).

23 мая гэтага года споўнілася 10 гадоў, як здзейсніў свой подзвіг лётчык Уладзімір Мікалаевіч Карват. Ён атрымаў адказнае заданне, на баявым самалёце ажыццяўляў вучэбны палёт. Пад час палёту адбылося нечаканае:

самалёт раптам пачало кідаць з боку ў бок, нечакана ўзнік пажар. З каманднага пункта паступіў загад пакінуць палаючы самалёт. Баявая машына падала на вёску.Уладзімір спрабаваў падпарадкаваць палаючую машыну, накіраваў самалёт у бок ад вёскі і не дапусціў падзення яго на населены пункт.

Жыхары вёскі Арабаўшчына Баранавіцкага раёна надоўга запомняць гэты дзень і на ўсё жыццё захаваюць у сэрцах удзячнасць лётчыку. У.М.Карват загінуў. Яму было ўсяго 37 гадоў. Уладзіміру Мікалаевічу першаму ў нашай краіне было пасмяротна прысвоена званне “Герой Беларусі”.

Як бачыце, даказаць сваю любоў да роднай зямлі, да народа можна і ў мірны час.

Мы ўжо з вамі гаварылі, што подзвігі могуць быць працоўнымі. Прыкладам такога гераізму можна лічыць жыццё і дзейнасць выдатных сыноў Беларусі—касманаўтаў
П.І.Клімука і У.В.Кавалёнка.

Некалькі разоў Пётр Ільіч і Уладзімір Васільевіч былі ў космасе. Кожны праявіў сябе самаадданым мужным, працалюбівым чалаекам. Наша Радзіма ганарыцца сваімі героямі-касманаўтамі.

--Хто з вас хацеў бы стаць касманаўтам?

--Што, на вашу думку, патрэбна, каб стаць ім?

--Чаму касманаўту патрэбны веды?

--Ці патрэбна яму фізічная падрыхтоўка?

У цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў у Зорным гарадку, непадалёку ад Масквы, будучых касманаўтаў чакаюць гады вучобы і сотні гадзін цяжкіх трэніровак.Патрэбна вывучыць будову карабля і апаратуры, асновы касмічнай медыцыны, астраномію, геафізіку і многае, многае іншае... А яшчэ фізічная і спецыяльная падрыхтоўка: шматкіламетровыя кросы, футбол, плаванне, прыжкі з парашутам, заняткі ў макеце касмічнага карабля, на спецыяльных трэнажорах... І ўсё гэта з дня ў дзень, з месяца ў месяц!

Стаць касманаўтам даволі складана: перш за ўсй трэба старанна вучыцца, займацца фізкультурай і спортам, выхоўваць у сабе сілу волі, смеласць, настойлівасць.

Рускі пісьменнік Максім Горкі пісаў, што ў жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу. Не ўсе могуць стаць лётчыкамі, як У.Карват, або касманаўтамі, як П.Клімук і У.Кавалёнак, але геройскі ўчынак можна здзейсніць у любы час, патрэбна толькі любіць сваю Радзіму і свой народ.

Веру, што мой разказ не пакінуў вас абыякавымі. На дошцы запісаны словы, якія выражаюць пачуцці і стан душы чалавека. Выберыце тое, якое найбольш пойна характарызуе ваш стан і пачуцці.

| | |
|---|---|
| раўнадушша | удзячнасць |
| павага | гонар |
| любоў | абыякавасць |

IV. Конкурс кемлівых.

1. Адгадванне загадак.

Хоць топчуць яе ,
І рэжуць, і б'юць—
Яна не злуе анічуць,
А толькі багаццем
Усім шчодра плаціць. (зямля)

Летам з жыта выглядае
Ён цікавым вочкам:
Ці не прыбягуць дзяўчаткі
Віць з яго вяночкі? (васілёк)

Урадзіўся ён высокі,
Шаўкавісты, сінявокі,
Апранае нас здавён,
Здагадайцеся, хто ён? (лён)

Праз горы, даліны, праз тысячы сёл
З далёкай краіны вярнуўся пасол.
Спаважны, чыноўны, ён стаў на страсе
У ботах чырвоных, каб бачылі ўсе. (бусел)

2. Слова рассыпалася.

Б, ь, е, а, р, у, л, с.
М, с, і, к, н.
Г, й, р, о, е.

Якія з гэтых слоў сёння сустракаліся на ўроку? Што абазначае трэцяе слова?

V. Заканчваецца наш урок, на якім мы вучыліся любіць Радзіму і ганарыцца ёй. Я спадзяюся, што вы станеце дастойнымі грамадзянамі нашай краіны, што ўсё сваё жыццё вы будзеце любіць яе так, як любілі нашы героі-землякі.